Источник: "Настаўніцкая газета" - 2019-05-04

**29 і 30 красавіка на базе Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства праходзіў заключны этап І Рэспубліканскага конкурсу навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў. Больш за 120 пераможцаў і прызёраў абласных і мінскага гарадскога этапаў прадстаўлялі свае праекты ў секцыях "Гісторыя роднага краю", "Культурная спадчына", "Геаграфічнае краязнаўства".**

# Навукова, краязнаўча, цікава

Год малой радзімы... Нядзіўна, што аўтары конкурсных праектаў прысвяцілі свае даследаванні падзеям і фактам гісторыі роднага краю, аб'ектам архітэктуры, помнікам археалогіі, этнаграфіі і фальклору, тапаніміцы, геалогіі, гідралогіі, прамысловасці малой радзімы. Прыемна, што з году ў год у краязнаўчых канферэнцыях, конкурсах, форумах прымае ўдзел усё большая колькасць навучэнцаў, усё больш хлопчыкаў і дзяўчынак становяцца даследчыкамі роднага краю. Разам з вучнямі вялікую работу праводзяць і педагогі, якія падтрымліваюць, накіроўваюць іх, перадаюць сваю захопленасць родным краем.

— Прыемна, што краязнаўчыя мерапрыемствы карыстаюцца поспехам і папулярнасцю, што з году ў год наша маладое пакаленне праяўляе цікавасць да навукова-даследчай дзейнасці. Сённяшнія прызёры і пераможцы, ды і проста ўдзельнікі ўжо многага дасягнулі ў такой важнай справе, як даследаванне малой радзімы. Усё ў вас наперадзе. Хочацца павіншаваць педагогаў і сказаць вялікі "дзякуй" за творчасць, падыходы ў выхаванні. Кожны юны талент як алмаз, з якога неабходна зрабіць брыльянт. Гэта задача педагогаў, і яна вельмі няпростая. Паважаныя навучэнцы, цаніце сваіх педагогаў і разумейце, што сённяшняе ваша дасягненне — гэта ў тым ліку дасягненне вашых педагогаў, — звярнуўся да ўдзельнікаў конкурсу намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі — начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Аляксандр Мікалаевіч Мацюшонак.

Па выніках конкурсу журы ў складзе супрацоўнікаў устаноў вышэйшай адукацыі, НАН Беларусі, Беларускага фонду культуры, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства вызначылі пераможцаў. У секцыі "Гісторыя роднага краю" дыпломам Міністэрства адукацыі І ступені ўзнагароджаны Аліна Зайцава з сярэдняй школы № 4 Горак, Ксенія Драгун з сярэдняй школы № 6 Рагачова. У секцыі "Культурная спадчына" пераможцамі сталі Аляксандра Казярожац з Лоеўскай сярэдняй школы імя А.В.Казлова, Ксенія Семяновіч з вілейскай гімназіі № 2, Кацярына Музычэнка з Пастаўскай гімназіі. У секцыі "Геаграфічнае краязнаўства" 1-е месца занялі Аляксандр Гіль з гімназіі № 2 Баранавіч, Уладзіслаў Каспяровіч з сярэдняй школы № 90 Мінска, Аліна Ламаза з Адрыжынскай сярэдняй школы Іванаўскага раёна.

Віншуем пераможцаў! З поўным спісам прызёраў можна азнаёміцца на сайце Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства *www.rcek.by*.

**Ігар ГРЭЧКА.**

Ігар Грэчка. Навукова, краязнаўча, цікава